**Вазняк, С.** Чалавек года Віцебшчыны / С. Вазняк // Лепельскі край. – 2023. – 17 лют. – С. 4.

## ЧАЛАВЕК ГОДА ВІЦЕБШЧЫНЫ



На аснове часткі трэцяй пункта 10 Інструкцыі аб парадку правядзення абласнога конкурсу па прысваенні ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны», зацверджанай рашэннем Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ад 5 кастрычніка 2017 года №614, Віцебскім абласным выканаўчым камітэтам прынята рашэнне прысвоіць ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны» 50 прадстаўнікам Віцебскай вобласці, сярод якіх лепшыя спецыялісты, перадавыя работнікі прамысловасці, гандлю і паслуг, фінансавай дзейнасці, малога і сярэдняга бізнесу, жыллёвакамунальнай і дарожнай гаспадаркі, будаўніцтва і архітэктуры, паліўна-энергетычнага комплексу, сувязі, транспарту, камунікацыі і г.д. Прыемна адзначыць, што сярод уладальнікаў ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны», ёсць і прадстаўнік Лепельскага раёна. У намінацыі «Аграпрамысловы комплекс, ахова навакольнага асяроддзя, лясная гаспадарка» ганаровае званне атрымае трактарыст-машыніст сельскагаспадарчай вытворчасці філіяла «Баброва – Агра» закрытага акцыянернага таварыства «Віцебскаграпрадукт» Аляксандр Зябко.

Урачыстае ўзнагароджанне ўладальнікаў ганаровага звання пройдзе сёння ў абласным цэнтры, у канцэртнай зале «Віцебск». Лепшыя прадстаўнікі шэрага галін народнай гаспадаркі атрымаюць заслужаныя ўзнагароды з рук старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра Субоціна.

**Святлана Вазняк**